вечера”, в котором принимают участие такие корифеи музыкального искусства, как М.Биешу, А.Эйзен, И.Оловников и др.

Велика роль симфонического оркестра г. Молодечно под руководством Р.Сороки в музыкальной жизни города. Коллектив, созданный на основе студенческого, сумел достичь высокого профессионального мастерства. С ним сотрудничают известные музыканты и композиторы республики Е.Глебов, В.Иванов, В.Скоробогатов, И.Оловников, М.Жилюк. Как отмечал К.Кондрашин, “...дирижер — это ведущая фигура, он воспитывает остальных служителей искусства и во многом поддерживает уровень музыкальной культуры” [1, с.174].

---


1. *Кондрашин К.П.* Мир дирижера. — Л.: Музыка. Ленингр. отд-ние, 1976. — 192 с.

2. *Бандарэнка М.* Гамяльчане апладыруюць // ЛіМ. — 1992. — 14 лют. — С.10 — 11.

3. *Гинзбург Л.М.* Избранное. — М.: Сов. композитор, 1981. — 304 с.

4. *Калектыў* нарадзіўся // Народная трыбуна. — 1993. — 13 сак. — С.2.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**І.А.Малахава,**
*дацэнт*

## ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ АСОБЫ СРОДКАМІ МАСТАЦТВА

Крэатыўнасць як універсальная здольнасць да творчасці з’яўляецца атрыбутыўнай характарыстыкай духоўнасці, адоранасці, умовай самавыяўлення асобы, галоўнай рухаючай сілай паступальнага развіцця чалавечага

грамадства. Кожны чалавек адораны ад прыроды, але праблема заключаецца ў вызначэнні сферы гэтай адоранасці з тым, каб развіваць і ўдасканальваць талент, творчыя здольнасці асобы.

Гуманістычная парадыгма сучаснай педагогікі абапіраецца на палажэнне аб тым, што задаткі здольнасцей да творчасці ўласцівы кожнаму чалавеку. Роля педагогаў заключаецца ў раскрыцці гэтых здольнасцей і стварэнні ўмоў для іх паспяховага развіцця. Разглядаючы крэатыўнасць як агульную, універсальную здольнасць да творчасці, мы дэкларуем яе першаступеннае значэнне, сэнсаўтваральную ролю ў структуры асобы кожнага чалавека.

І ў гэтым сэнсе ролю мастацтва нельга недаацэньваць. Тым больш, што выхаваўчае ўздзеянне мастацтва не толькі ў спецыфічна мастацкім, але і ў агульным развіцці асобы прызнаецца навукоўцамі розных краін. Назапашаныя на сённяшні дзень факты, назіранні асобных педагогаў, даныя, атрыманыя айчыннымі і замежнымі даследчыкамі, дазваляюць сцвярджаць, што мастацкая дзейнасць дзіцяці дабратворна ўплывае на развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Таму далучэнне да мастацтва вельмі важна не само па сабе, а менавіта ў якасці перадумовы аднаго з магутнейшых сродкаў уздзеяння на станаўленне і развіццё асобы.

Сучасныя даследчыкі, аналізуючы мастацтва як сродак стымулявання вобразнага мыслення, духоўнага ўзбагачэння, эмацыянальнай разрадкі і каталізатара патрэбнасцей у самых розных відах творчасці, у большасці выпадкаў не разглядаюць вынікі зносін чалавека з мастацтвам, функцыі мастацтва ў агульным развіцці асобы. Таму вывучэнне псіхолага-педагагічных механізмаў фарміравання асобы сродкамі мастацтва — актуальная праблема мастацкага выхавання, рашэнне якой дазволіць пазбавіцца ад многіх супярэчнасцей у развіцці асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце "мастацтва" выкарыстоўваецца ў некалькіх сэнсах. Па-першае, мастацтва – гэта ўсякае майстэрства; па-другое, мастацтва – гэта творчасць па законах прыгажосці, якая ўключае і законы творчай дзейнасці, уласцівыя любой прафесіі; па-трэцяе, мастацтва – гэта мастацкая дзейнасць. У гэтым сэнсе мастацтва з'яўляецца часткай духоўнага жыцця грамадства і формай грамадскай свядомасці. У сувязі з гэтым мастацтва ўяўляе эфектыўны сродак выхавання творчай асобы, садзейнічае выяўленню унікальнага асобаснага "я", эмацыянальнаму разняволенню і, такім чынам, дае магчымасць самастойнай рэалізацыі крэатыўнасці асобы ў прадукцыйнай мастацкай дзейнасці. Тэрмін "крэатыўнасць" з'явіўся ў навуковым ужытку ў сферы мастацкага выхавання. Даследчыкі падкрэсліваюць узаемасувязь крэатыўнасці як інтэгратыўнай якаснай характарыстыкі асобы і мастацтва ва ўсёй разнастайнасці відаў і жанраў як сродку яе развіцця.

Асобая роля мастацтва даказваецца не толькі тэарэтыкамі мастацкага выхавання, але і дзеячамі навукі. Вывучаючы асаблівасці навуковай творчасці, К.Тэйлар адзначаў, што мастацкае выхаванне з'яўляецца больш каштоўным у век навукі, чым гэта звычайна прызнавалася. У адрозненне ад выхавання навуковага мастацкае выхаванне заўсёды ставіла заахвочванне і развіццё здольнасці да творчасці як сваю цэнтральную ці адну з цэнтральных задач [1, с. 12].

Падобныя вывады зроблены ў вопытна-эксперыментальным даследаванні Э.Н. Гарухінай, якая лічыць, што "саюз навуковага і мастацкага мыслення ... нараджае творчыя здольнасці старшакласнікаў" [2, с. 69]. Відавочнасць таго факта, што мастацкая дзейнасць дзіцяці стымулюе развіццё пэўных інтэлектуальных і творчых здольнасцей, пераканаўча даказалі практычныя эксперыменты Л.А. Пійрсалу [3]. Сутнасць іх зводзілася да таго, што ў пачатковых класах эстонскіх школ павелічэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасці гадзін на ўрокі выяўленчага мастацтва пры адпаведным скарачэнні гадзін на ўрокі матэматыкі мела станоўчыя вынікі не толькі ў фарміраванні эстэтычных якасцей асобы, але і прывяло да павышэння паспяховасці па матэматыцы і іншых дакладных навуках. В.А. Круцецкі, які доўгі час назіраў за адоранымі ў матэматыцы дзецьмі 6—13 гадоў, выявіў схільнасць іх да мастацтва: менш — да літаратуры, больш — да музыкі і выяўленчага мастацтва [4, с. 211—245].

Гэтыя і іншыя факты сцвярджаюць ролю мастацтва як сродку стымулявання вобразнага мыслення, духоўнага ўзбагачэння, эмацыянальнай разрадкі і каталізатара патрэбнасцей у самых розных відах творчасці. Так, у навуковых даследаваннях былі тэарэтычна абгрунтаваны значнасць уяўлення ў дзейнасці вучонага і неабходнасць для матэматыка трэніраваць уменне аперыраваць сімваламі, дзе вялікую дапамогу аказвае музыка [5]; актыўная роля эмоцый у творчым працэсе [6]. Сучасныя даследчыкі [7] разглядаюць мастацтва як фактар інтэлектуальна-творчага развіцця школьнікаў. Яны лічаць, што вобразнае арыгінальнае мысленне, уяўленне, фантазія, інтуіцыя не толькі даюцца чалавеку ад прыроды, але і могуць быць развіты пад уздзеяннем творчага патэнцыялу мастацтва.

Неабходнасць мастацкага выхавання дзяцей пацвярджаюць і сучасныя навуковыя даныя аб лакалізацыі функцый левага і правага паўшар'яў мозгу і сувязі аднаго з іх пераважна з эмацыянальнай, вобразнай асаблівасцю мыслення, а другога – з лагічна мысліцельнай дзейнасцю [8]. Акрамя таго, вывучэнне крэатыўнасці на матэрыяле мастацтва, зробленае В.Лоунфельдам і К.Бэйтэлам, а на матэрыяле дакладных навук Дж.Гілфардам, пераканаўча даказвае унікальную ролю мастацтва ў развіцці крэатыўнасці як універсальнай здольнасці да творчасці. На падставе атрыманых вынікаў быў зроблены вывад аб тым, што крэатыўнасць у мастацтве і навуцы мае агульныя адзнакі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па словах В.Лоўнфельда, “цяпер даказана неабходнасць мастацкага вопыту для ўсіх дзяцей, асабліва тых, у якіх не ўдаецца развіць здольнасць да творчасці на навуковым матэрыяле, таму што творчая здольнасць можа быць перанесена з аднаго матэрыялу на другі. Гэта павінна ўмацаваць пазіцыі мастацкіх прадметаў у сістэме школьнай работы” [9, с. 8].

Такім чынам, вынікі зносін чалавека з мастацтвам можна разглядаць не толькі як крыніцу абуджэння здольнасці ўспрымаць і ствараць прыгожае, але і значна шырэй. Мастацтва разглядаецца як сродак развіцця спецыфічнай, усеагульнай універсальнай творчай здольнасці, якая “можа рэалізавацца ў любой сферы чалавечай дзейнасці і пазнання: і ў навуцы, і ў палітыцы, і ў быце, і ў непасрэднай працы” [10, с. 33]. Усё гэта даказвае магчымасць пераносу творчай здольнасці з аднаго віду дзейнасці на другі. Дж.Радары пісаў, што дзіця, заахвочанае да прыдумвання новых слоў, потым прыменіць той жа метад да другіх відаў вопыту, якія патрабуюць творчага падыходу [11].

Значыць, здольнасць да пераносу ведаў і ўменняў у новую сітуацыю дазваляе акцэнтаваць увагу педагогаў на пераважным развіцці найбольш выяўленых творчых якасцей асобы ў той ці іншай дзейнасці, якая па прычыне сваёй прыцягальнасці будзе больш поўна развіваць і крэатыўнасць. Вырашаючы якую-небудзь новую праблему, чалавек здольны выкарыстоўваць для гэтага веды і ўменні, засвоеныя раней. Гэта не заўсёды лёгка зрабіць, асабліва, калі засвоеныя веды з другой галіны, чым вырашаемая праблема.

У працэсе творчай дзейнасці на матэрыяле мастацтва адбываюцца своеасаблівае асэнсаванне адносін чалавека да рэчаіснасці, усведамленне сацыяльнай значнасці яго як члена грамадства, умацоўваецца ўпэўненасць у сабе. Веды і навыкі, набытыя ў працэсе мастацкай творчасці, чалавек можа пераносіць у працоўную, вучэбную, сацыяльна значную дзейнасць, а таксама ў сферу быту, даводзячы іх да ўзроўню эстэтычнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, далучэнне дзяцей да мастацтва стымулуе развіццё здольнасцей, таму што мастацтва выступае, з аднаго боку, як сродак актывізацыі і ўмацавання ўласцівасцей і здольнасцей, неабходных у іншых відах дзейнасці, з другога, мастацтва – гэта спецыфічная форма пазнання рэчаіснасці, неад'емная частка мастацкай культуры, без авалодання якой немагчыма плённае развіццё асобы, як агульнае, так і спецыяльнае. Дарэчы, працэс мастацкага выхавання неабходна разглядаць як спалучэнне трох асноўных ведаў дзейнасці: знаёмства з мастацкімі творамі, набыццё мастацказнаўчых ведаў і непасрэдна мастацкая творчасць. Паспяховае развіццё крэатыўнасці ў працэсе мастацкага выхавання будзе залежаць ад збалансаванага спалучэння гэтых трох відаў мастацкай дзейнасці.

Актывізацыя зносін з мастацтвам менавіта ў падлеткавым узросце неабходна па прычыне псіхафізіялагічных і сацыяльных змен, якія адбываюцца ў гэты перыяд. Пашыраючы рамкі асабістага жыццёвага вопыту падлеткаў, мастацтва з'яўляецца сродкам самапазнання і самавыяўлення. Галоўнае, чым падлеткавы перыяд адрозніваецца ад іншых этапаў развіцця асобы, — гэта выхад дзіцяці на якасна новую сацыяльную пазіцыю, дзе фарміруюцца яго свядомыя адносіны да сябе як члена грамадства. Цэнтральным псіхічным працэсам пераходнага ўзросту з'яўляецца развіццё самасвядомасці. У аснове механізма развіцця самасвядомасці ляжыць рэфлексія. Пад уплывам пашыраных патрабаванняў да навучання, працоўнай дзейнасці, сацыяльнай і бытавой сфер падлеткі асэнсоўваюць дзве сістэмы адносін – з равеснікамі і з дарослымі.

Менавіта ў пераходзе ад статусу дзіцяці да статусу дарослага звязана станаўленне дарослосці ў падлеткаў. В.Сухамлінскі так адзначыў галоўную супярэчнасць унутранай пазіцыі падлетка: з аднаго боку, імкненне да самастойнасці, пратэст супраць апекі, кантролю і недаверу, з другога – трывога і страх не справіцца з новымі задачамі.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, асноўная характарыстыка падлеткавага перыяду развіцця асобы – нераўнамернае фарміраванне ўсіх сістэм арганізма, што выяўляецца ў неўраўнаважнасці і непаслядоўнасці паводзін і дзеянняў. Пры гэтым кардынальныя змены ў псіхафізіялогіі і сацыяльным статусе з’яўляюцца прычынай сензітыўнасці падлеткавага ўзросту да развіцця крэатыўнасці. А паколькі мастацтва – своеасаблівая мадэль чалавечай культуры, сканцэнтраванае адлюстраванне ідэалу эпохі, таму далучэнне да мастацкіх каштоўнасцей садзейнічае развіццю патрэбнасці ў актыўнай дзейнасці па законах прыгажосці. Апошняе асабліва актуальна ў падлеткавым узросце, калі на першы план выступае патрэбнасць у практычных дзеяннях.

Сучасныя даследчыкі творчага развіцця ў працэсе мастацкай дзейнасці [7] прызнаюць існаванне па меншай меры пяці асноўных відаў мастацтва: літаратура, кіно, музыка, тэатр, выяўленчае мастацтва. У тэорыі мастацкага выхавання існуе пункт погляду, згодна з якім розныя віды мастацтва неаднолькава ўздзейнічаюць на дзіця ў той ці іншы ўзроставы перыяд. Так, “у кожным школьным узросце ёсць пэўныя віды мастацтва, пераважная цікавасць да якіх вельмі эфектыўная для мастацкага развіцця навучэнцаў… Але пры гэтым школьнік не павінен страціць цікавасць да ўсіх іншых відаў мастацтва, гэта значыць, неабходна ўзбагачаць яго ўражаннямі ва ўсіх відах мастацтва” [12, с. 142].

Такім чынам, эфектыўнымі сродкамі развіцця крэатыўнасці асобы можа служыць вялікі выхаваўчы патэнцыял мастацтва па прычыне яго поліфункцыянальнай сутнасці і мастацкая дзейнасць, ажыццяўляемая па трох кірунках: успрыманне мастацтва, атрыманне ведаў аб мастацтве і непасрэдная мастацкая творчасць. Неабходнасць развіцця творчых якасцей у падлеткавым узросце абумоўлена перш за ўсё кардынальнымі зменамі ў псіхафізіялогіі і сацыяльным статусе падлеткаў, а таксама асаблівасцямі вучэбнай дзейнасці, накіраванай на рэпрадуцыраванне ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мастацкая дзейнасць у гэтым узросце дазваляе пераарыентавацца на развіццё творчых здольнасцей, таму падлеткавы ўзрост разглядаецца як сензітыўны перыяд развіцця крэатыўнасці асобы сродкамі мастацтва.

---

1. *Taylor C.W.* The Minnesota studies of creative thinking // Taylor C.(Ed.) Widening horizons in creativity. – N.Y., 1964.

2. *Формирование* творческих способностей: сущность, условия, эффективность: Сб. научн. тр./Отв. ред. С.З. Гончаров. – Свердловск, 1990.

3. *Пийрсалу Л.А.* Влияние расширенного художественного обучения на умственное развитие учащихся: Автореф. дис. ... канд. пед. наук. – Л., 1978.

4. *Крутецкий В.А.* Психология математических способностей школьников. — М., 1968.

5. *Петров В.М.* О построении функциональной дедуктивной классификации культурных процессов // Модели и методы исследования социально-экономических процессов. — М., 1976.

6. *Что* такое эвристика. – 2-е изд., доп. и перераб. — Мн., 1988.

7. *Искусство* как фактор интеллектуально-творческого развития школьников: Сб. науч. тр./ Под ред. Ю.У. Фохта-Бабушкина, Е.К. Чухман. — М., 1980.

8. *Павлов И.П.* Избранные произведения / Под ред. Х.С.Коштоянца. — М., 1951.

9. *Lowenfeld. V.* The Adolescence of art education //School art, 1959. – Vol.5, №2.

10. *Ильенков Э.В.* О специфике искусства // Вопросы эстетики. — 1969. — № 4.

11. *Родари Дж.* Грамматика фантазии: введение в искусство придумывания историй / Пер. с итал. Ю.А.Добровольской. — М., 1990.

12. *Исследование* художественных интересов школьников / Под ред. Е.В.Квятковского, Ю.У. Фохта-Бабушкина. — М., 1974.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ